# АДЗЕННЕ ПРАДСТАЎНІКОЎ ШЛЯХЕЦКАГА САСЛОЎЯ ЧАСОЎ ВКЛ

*Грамыка М.Р.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Мікалаева Л.В. – канд. гіст. навук, дацэнт*

Разглядаюцца асаблівасці кшталтавання модных кірункаў у адзенні шляхты ВКЛ.

У жыцці чалавека адзенне заўсёды займала значнае месца. У сваім даследаванні я хачу разгледзець касцюмы шляхты ВКЛ.

Паводле гістарычных крыніц, вялікі князь Вітаўт у канцы XIV – пачатку XV ст. і яго прыдворныя насілі як мясцовыя, так і заходнееўрапейскія ўборы.

Аднак масавае распаўсюджванне на тэрыторыі ВКЛ сярод шляхты розных формаў заходнееўрапейскага касцюма даследчыкі звязваюць з часам кіравання Жігімонта І Старога і прыездам у Польшчу з Італіі яго другой жонкі Боны Сфорца.

Заходнееўрапейскі ўплыў на касцюм ВКЛ узмацніўся пры Жыгімонце ІІ Аўгусце. У кнігах рахункаў яго двара за 1544–1567 гг. зафіксаваныя тры групы стылістычна розных гарнітурных камплектаў. Да першай адносіліся касцюмы па мясцовай польска-літоўскай модзе, другую складалі па італьянскай і іспанска-нямецкай модзе, трэцюю – па венгерскай модзе.

У XVI ст. у Еўропе самай уплывовай стала іспанская палацавая мода, якая сфармавалася пад жорсткім дыктатам каталіцкай царквы, якая забараняла жанчыне адкрываць шыю, рукі і ступні ног. Асаблівасцямі гэтага касцюма, зацягваць постаць жанчыны, як у футляр, былі цвонападобная спадніца на абручах з вярбовых дубцоў, дроту або кітовага вуса, туга зацягнутая гарсэтам грудзі, вузкія рукавы з буфамі на плячах і круглы, накрухмалены каўнер-фрэза, на якім галава ляжала як на страве.

Тады форма адзення, каштоўнасць тканіны і футра, з якіх быў пашыты касцюм, з’яўляліся сацыяльным маркерам, сведчаннем заможнасці яго ўладальніка і яго месца ў структуры грамадства. Статусная роля адзення была замацавана заканадаўча: пастановамі сеймаў Рэчы Паспалітай 1613, 1620 і 1665 гг. асобам нешляхецкага паходжання забаранялася насіць адзенне з шоўку, аксаміту, каштоўнага футра, тканіны пурпуровага колеру, за нашэнне зброі тыпу «ардынкі», шабляў, мячоў, упрыгожанняў з серабра, золата, перлін прадугледжваўся штраф.

Калі касцюм шляхты ВКЛ развіваўся ў рэчышчы еўрапейскай палацавай моды, то касцюм служылай шляхты ў XVI–XVIII стст. захоўваў усходне-візантыйскія рысы, пастаянна папаўняючыся падчас войнаў і сутычак з татарамі і туркамі прадметамі іх адзення. Для гэтага касцюма характэрны доўгі, пашыраны дадолу ад лініі таліі сілуэт. На кашулю і штаны шляхцічы апраналі падпяразаны жупан, а зверху розныя віды верхняга адзення (дэліі, ферэзі, газукі, чугі, чамары, футры і т.д.) з усходніх ўзорыстых тканін, падбітыя мехам рысі, бабра, куніцы, вавёркі, лісы.

Да сярэдзіны XVII ст. шляхта ВКЛ і Польшчы не мела свайго этнічна акрэсленага касцюма. Дэталі ваеннага ўзбраення і адзенне шляхціча XVII ст. мелі ўсходняе паходжанне. Па заходнееўрапейскай модзе апраналася найчасцей моладзь з асяроддзя магнатаў і багатай шляхты, якая шмат падарожнічала, вучылася ў еўрапейскіх універсітэтах. Згодна з пісьмовымі і выяўленчымі крыніцамі, вышэйшае саслоўе ВКЛ ўжо ў другой палове XVI–XVII ст. ацаніла зручнасць еўрапейскага касцюма і шырока ім карысталася. У 1640-х гг. сярод шляхты на тэрыторыі Рэчы Паспалітай пашырыўся новы від верхняга наплечнага адзення кунтуш. У спалучэнні з жупаном і доўгімі нагавіцамі, якія запраўляліся ў боты, ён хутка стаў асноўным касцюмным камплектам усіх станаў шляхты амаль да канца XVIII ст.

Такім чынам параўнаўшы касцюмы шляхты ВКЛ розных стагоддзяў можна прасачыць уплыў розных краін у розныя перыяды часу, гэтак жа на прыкладзе Усходне-візантыйскіх краін па элементах адзення мы можам вызначыць з кім ваявала ВКЛ. Цяпер з дапамогай адзення выказваюць сваю асабістую асобасць, а тады па вопратцы можна было вызначыць веру чалавека, род занятку, сацыяльнае становішча.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Махоўская, І. Адзенне / І. Махоўская // Вялікае княства Літоўскае : Энцыклапедыя. У 3 .т. – Мінск : БелЭн, 2005−2010. – Т. 1. : Абаленскі-Кадэнцыя / Рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. ; Маст. З. Э. Герасімовіч. – 2005. – 688 с. : іл. – С. 91−97.*